21.11.2014

# Кніжная спадчына Францыска Скарыны



*18 лістапада* 2014 года ў ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага" адбылася прэзентацыя і ўрачыстая цырымонія перадачы ў дар публічным бібліятэкам Гродзенскай вобласці факсімільнага выдання *"Кніжная спадчына Францыска Скарыны"*.

Удзел у мерапрыемстве прымалі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Скрабко Павел Канстанцінавіч, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Вярсоцкі Аляксандр Людвігавіч, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Матульскі Раман Сцяпанавіч, загадчык аддзела бібліятэказнаўства НББ Пшыбытка Марына Георгіеўна, кіраўнікі цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Гродзеншчыны, гісторыкі, навукоўцы, студэнцкая моладзь, чытачы абласной бібліятэкі.

Падчас прэзентацыі Матульскі Р.С. расказаў прысутным пра рэалізацыю агульнанацыянальнага праекта па выпуску поўнага збору кніг першадрукара Беларусі Францыска Скарыны, які разлічаны на перыяд 2013-2017 гг. і прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Першыя пяць тамоў выйшлі ў 2014 годзе і папоўняць фонды публічных бібліятэк Прынёманскага краю.

Дзякуючы гэтаму выданню чытачы змогуць пазнаёміцца з кнігамі, якія былі надрукаваны Ф.Скарынам у Празе і Вільні. Усе выданні суправаджаюцца каментарыямі навукоўцаў, а таксама перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны на беларускую, рускую і англійскую мовы.

Выданне "Кніжная спадчына Францыска Скарыны" – цудоўны падарунак для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.





